вич подчеркивал ее общественный характер, призванный служить широким интересам правосудия.

Много внимания В.Д. Спасович уделял обвинению в судебном процессе. Он считал, что в деятельность прокурора должна быть внесена моральная дисциплина, при которой интересы общества и честь подсудимого будут защищаться с одинаковой заинтересованностью. В случае, если ход судебного следствия не подтвердит вины подсудимого, прокурор обязан отказаться от обвинения.

Большой вклад в науку внесли разработанная В.Д. Спасовичем теория судебно-уголовных доказательств, теория взлома, большое количество работ по вопросам уголовного права и процесса.

Литературные труды В.Д. Спасовича свидетельствуют о большом таланте и многогранности его интересов. Деятельность этого замечательного юриста оставила яркий след в истории дореволюционной русской адвокатуры. Если вдумчивость в дело, изучение его во всех мельчайших подробностях, отсутствие напускного пафоса и простота речи, глубина и богатство ее содержания, должны служить образцом и примером для лиц, посвящающих себя адвокатуре, то такой образец дан судебной деятельностью Спасовича.

**_У.А. Жукавец_**
БДЭУ (Мінск)

# ТРАЦЕЙСКІЯ СУДЫ Ў БЕЛАРУСІ Ў ПАЧ. XV—XVI ст.

Трацейскі суд — адзін з відаў альтэрнатыўнага урэгулявання спрэчак, а таксама інстытут самарэгулявання ў грамадстве, які ажыццяўляе правапрымяняльную дзейнасць на падставе узаемнага волевыяўлення бакоў.

У ВКЛ трацейскія суды зваліся «палюбоўнымі». Гісторыя стварэння трацейскіх судоў пачынаецца з Судзебніка Казіміра 1468 г., у якім замацоўваўся інстытут выездных судоў па зямельным спрэчкам. У склад гэтых судоў уваходзілі «ездокі» — суддзі, якія выязджалі на месца дзеля вырашэння зямельных спрэчак, інакш кажучы, межавыя суддзі.

Палюбоўны суд разглядаў розныя спрэчкі і справы, за выключэннем крымінальных, звязаных з інтарэсамі дзяржаўнага скарбу. Ён складаўся з некалькіх суддзяў — камісараў, якія абавязкова павінны былі належаць да таго ж саслоўя, што і бакі.

У гістарычных крыніцах трацейскія суддзі звычайна называюцца ездакамі, «суддзямі полюбовными», «суддзямі прошеными» ці проста суддзямі, а сам трацейскі суд — «обчим судом». Трацейскіх суддзяў запрашалі самі суцяжнікі. Дзяржава санкцыянавала дзейнасць тра-



БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by

цейскіх судоў і прызнавала іх рашэнні роўнымі з рашэннямі дзяржаўных судоў па юрыдычнай сіле. Не здавальняючыся гэтым, суцяжнікі часта прасілі гаспадара ці яго намесніка зацвердзіць кандыдатуры трацейскіх суддзяў і тым самым санкцыянаваць будучае судовае рашэнне, надаць яму аўтарытэт у вачах грамадства і саміх бакоў, а таксама застрахавацца ад магчымых скарг і папрокаў з боку, які прайграў справу. Для назірання за ходам судовага разгляду часта запрашалі віжа (па Статуту 1529 г., а па Статутам 1566 і 1588 гг. — возны). Гэта службовая асоба, прадстаўнік судовай улады, які быў павінен кантраляваць ажыццяўленне правасуддзя і законнасць прынятага рашэння.

Заканадаўства ВКЛ не ўсталёўвала колькасьці трацейскіх суддзяў і не прад'яўляла да кандыдатаў канкрэтных патрабаванняў.

Прызначаны трацейскім судом тэрмін разгляду зямельнай справы быў канчатковым і абавязковым для бакоў. Нез'яўленне трацейскіх суддзяў ад аднаго з бакоў не перашкаджала разгляду справы, за выключэннем хваробы суддзяў, выканання імі ваеннай ці дыпламатычнай службы, знаходжання ў палоне. Спор павінны былі вырашаць прыбыўшыя суддзі, рашэнне якіх было абавязковым для абодвух бакоў. Адкласці разгляд справы ў сувязі з нез'яўленнем суддзяў ад аднаго з бакоў можна было толькі ў тым выпадку, калі гаспадар ці паны-рада, якія санкцыянавалі трацейскі суд, пісьмова агаварылі такую магчымасць. Паводле Літоўскага Статуту 1529 г., трацейскі суд павінен быў выслухаць патрабаванні і адказы абодвух бакоў, азнаёміцца з дакументамі, агледзець межавыя знакі і заклікаць да прысягі той з бакоў, чые доказы выглядалі больш пераканаўча.

Сутнасць справы, ход разгляду, доказы і заявы бакоў, дзеянні суддзяў і прынятае імі рашэнне коратка выкладаліся ў дакуменце, названым «вырок» (судовае рашэнне). Вядома нямала выпадкаў, калі трацейскія суддзі з-за разыходжання ў поглядах былі не ў стане вырашыць спрэчку і перадавалі справу на разгляд вялікакняжацкаму суду.

Першапачатковая рэдакцыя Літоўскага Статуту 1529 г. не рэгламентавала перадачы справы ад трацейскага ў дзяржаўны суд — пытанне вырашалася індывідуальна ў кожным пэўным выпадку. Часам вялікі князь загадзя вызначаў парадак такой перадачы.

Нельга не заўважыць, што трацейскія суды нярэдка вырашалі сацыяльна значныя і даволі заблытаныя справы аб зямельнай уласнасці, ускладненыя сустрэчнымі позвамі і скаргамі пра прычыненне шкоды. Звычайна такія справы ўзбуджаліся ў дзяржаўных судах, якія перадавалі іх на разгляд трацейскім судам.

У святле сучасных патрабаванняў да пашырэння выкарыстання прымірыльных працэдур для вырашэння разнастайных спраў гістарычны вопыт мае бясспрэчнае значэнне.

БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by